# НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ РУБРЫКІ «КНИЖНЫЙ НАВИГАТОР» («СБ. Беларусь сегодня»)

***Н. В. Кузьміч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*kuzmich_nv@mail.ru*

Вывучэнне асаблівасцей масавай культуры ў тэкстах літаратурнай крытыкі – адно з цікавых пытанняў журналістыкі. У артыкуле разглядаюцца некаторыя асаблівасці рубрыкі «Книжный навигатор» (аўтар Людміла Рублеўская, «СБ. Беларусь сегодня»). Матэрыял можа быць выкарыстаны пры разглядзе пытанняў функцыянавання літаратурнай крытыкі на сучасным этапе.

***Ключавыя словы:*** артэфакт; масавая культура; Людміла Рублеўская; прэзентацыя.

# SOME FEATURES OF THE RUBRIC «KNIZHNYI NAVIGATOR» («SB. Belarus today»)

***N. V. Kuzmich***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. V. Kuzmich (kuzmich_nv@mail.ru)*

The study of the features of mass culture in the texts of literary criticism is one of the interesting issues of journalism. The article discusses some features of the heading «Knizhnyi novigator» (author – Lyudmila Rublevskaya, «SB. Belarus today»). The material can be used in the study of the functioning of literary criticism at the present stage.

***Keywords:*** artifact; mass culture; Lyudmila Rublevskaya; presentation.

Паводле вызначэння ЮНЕСКА (спецыялізаваная арганізацыя Аб’яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры), прэса, г. зн. газеты і часопісы, адносіцца да сферы культуры, дакладней – да духоўнай культуры, якая ўяўляе сабой сукупнасць каштоўнасцей, створаных чалавекам у працэсе грамадска-гістарычнай дзейнасці.

З’яўляючыся па сваёй сацыяльна-грамадскай сутнасці прадуктам культуры, прэса як артэфакт уяўляе сабой носьбіта культурных каштоўнасцей, больш за тое – стваральніка іх у адмысловай форме праз камунікатыўную функцыю. Яна даносіць гэтыя каштоўнасці да спажыўца, робіць іх агульнадаступнымі для ўспрымання і разумення праз агляды, прэзентацыі, творчыя партрэты і іншае. Такім чынам, можна сказаць, своеасабліва трансліруе іх на масавую чытацкую аўдыторыю.

Зразумела, што прэса у межах сваёй спецыфікі выкарыстоўвае разнастайныя спосабы падачы артэфактаў са сферы культуры, у тым ліку твораў мастацкай літаратуры. Пастаяннымі сталі адпаведныя рубрыкі як у спецыялізаваных, так і ў грамадска-палітычных выданнях, напрыклад: «Літаратура і час», «Крытыка і літаратуразнаўства», «Майстэрня пісьменніка» і г. д. Асобныя выданні, часцей за ўсё рэгіянальныя, пастаянна выпускаюць літаратурныя старонкі, дзе змяшчаюцца паэтычныя і празаічныя творы, літаратурна-мастацкая публіцыстыка і крытычныя матэрыялы.

На наш погляд, цікавы праект, які мае на мэце папулярызаваць навінкі літаратурнай творчасці, знойдзены ў газеце «СБ. Беларусь сегодня». Маецца на ўвазе рубрыка «Книжный навигатор», якую вядзе пісьменніца, літаратурны крытык Людміла Рублеўская. Трэба падкрэсліць, што рубрыка ў выданні з’яўляецца на пастаяннай аснове; яна заняла трывалае месца, стала прыкметнай і пазнавальнай.

Адмыслова пабудавана структура рубрыкі. Як правіла, пад ёй прадстаўляюцца дзве навінкі літаратуры. Звычайна адна навінка – твор беларускага аўтара, другая літаратурная навінка мае аўтара з далёкага ці блізкага замежжа. Але такое суседства лагічнае. Абодва выданні, якія прадстаўляюцца тут, з’яднаны або адной тэмай, або нейкімі ўнутранымі сувязямі, якія адчуваюцца ў канцэпцыі твораў або ў рытміка-інтанацыйнай ці эмацыйнай настраёвасці. Знешне злучаюцца адным загалоўкам. Такія публікацыі можна назваць прэзентацыямі кніг, якія могуць зацікавіць масавага чытача.

Напрыклад, у № 64 ад 05.04.2019 г. пад рубрыкай «Книжный навигатор» побач стаяць дзве новыя кнігі: Алеся Жука «Свята дажджу» (аповесці, апавяданні. Мн., Маст. літ, 2019) і кітайскага аўтара Лю Саолуна «Звуки, чарующие сердце» (Мн., Маст. літ, 2018). Знешне названыя кнігі змацоўвае адзін агульны загаловак «Журавлиная мелодия». І загаловак гэты зусім не выпадковы. Аўтар публікацыі прыкмячае, што і ў беларускага пісьменніка, і ў кітайскага ёсць агульнае – песня душы, у якой адчуваецца мелодыя хараства і праўды жыцця; хаця жанры кніг

розныя: у Алеся Жука – мастацкі твор, у кітайскага аўтара – даследаванне пра музычную культуру сваёй краіны ад старажытных часоў да сучаснай знакамітай кантаты «Взреви, Желтая река!» і сучасных мультымедыйных твораў.

Па такім жа прынцыпе зладжаны публікацыі ў газеце пра іншыя кніжныя навінкі. Знойдзена рацыянальная форма, у ёй арганічна спалучаюцца змястоўнасць і займальнасць – жанравая і эстэтычная адметнасць прадукту так званых масавай і элітарнай культур. Адкрываюцца панарамы падзей у свеце кніжных навінак, выдадзеных у нашай краіне і ў суседніх дзяржавах. Людміла Рублеўская дакладна сумяшчае аналітыку з прафесійнай назіральнасцю, што ўзмацняе цікавасць да рубрыкі.

Напрыклад, у № 124 ад 05.07.2019 г. пад агульным загалоўкам «Космас у малінавых кустах» аўтар рубрыкі знаёміць чытачоў з кнігамі Сяргея Белаяра «Расследаванні інспектара Сарвы» (Мн., Галіяфы, 2018) і Юльюша Славацкага «Баладына» (Мн., 2018). Першая – дэтэктыў у дэкарацыях касмічнай базы, тут містычныя рэчы знаходзяць рэалістычнае тлумачэнне, уплятаюцца ў сюжэт гістарычныя тэорыі. Другая – драма на пяць дзеяў, гэта адно з самых значных дасягненняў вялікага польскага паэта эпохі рамантызму. Цяпер літаратурны помнік загучаў на беларускай мове. Таксама ў № 69 за 12.04.2019 г. пад загалоўкам «Миры междумирия» побач размясціліся кнігі Веры Бурлак «Фантазюркі» (Мн., Галіяфы, 2018 г.) і Клайва Стэйплза Льюіса «Письма Баламута. Баламут предлагает тост» (Изд. АСТ, Москва, 2019). У абодвух выданняў скразная тэма – гумар. Яго асаблівасці даюцца коратка, ёміста, з глыбокім пранікненнем у сутнасць. Падкрэсліваецца, што алюзіі ў Веры Бурлак можна ўспрыняць па-рознаму. Тым, хто не разумее гумару, рэкамендуецца кнігу не чытаць. Герой жа Льюіса, шматаблічны і пераменлівы, які то вытанчана жартуе, то блюзнерыць – у залежнасці ад таго, з кім мае ўзаеміны, раскрыты ярка, у выразных дэталях.

Такім чынам, як бачна, розныя мастацкія жанры і героі, розныя выяўленчыя сродкі, але дакладна акрэсліваецца галоўнае – гумар можа ўзбагачаць і аб’ядноўваць як здабытак масавай культуры.

Падобных прыкладаў, калі ў рубрыцы «Книжный навигатор» удалыя задума і рэалізацыя, дастаткова. Характэрна, што пад адной шапкай знаходзяцца, здавалася б, розныя, але ў той жа час блізкія па сэнсе кніжныя навінкі. Урэшце іх збліжае пазіцыя аўтара, яго нябачная прысутнасць і дакладны аналітычны падыход да мастацкіх з’яў. У выніку ствараецца цэласны паток карыснай і патрэбнай інфармацыі для тых, хто цікавіцца кніжнай індустрыяй як у Беларусі, так і ў замежжы.

З прыведзенага вынікае, што газета як прадукт масавай культуры ў той жа час на сваіх старонках сама генерыруе такую культуру, якая нярэдка суседнічае з элітарнай. Гэтая з'ява становіцца звычайнай. Тут мае месца дыфузійны працэс, які сведчыць аб тым, што сёння масавая культура і элітарная знаходзяцца ў стане ўзаемадзеяння. Калі яшчэ нядаўна маскультура ўспрымалася як нешта другараднае, то цяпер яна з'яўляецца ў сваіх найлепшых узорах раўнапраўным гульцом на сацыяльна-культурнай і грамадскай пляцоўках.

## О МАРКЕРАХ КАНОНИЧЕСКОЙ ПОЭТИКИ В РОК-ПОЭЗИИ А. БАШЛАЧЁВА («На жизнь поэтов»)

***Е. В. Локтевич***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*lichorad.kat@mail.ru*

Выявление и интерпретация особенностей субъектно-образной структуры рок-поэзии А. Башлачёва является актуальной задачей современного литературоведения, так как коммуникативный строй произведений автора и взаимосвязь их идейного уровня с субъектной организацией и образной сферой в контексте теоретической поэтики ранее не изучались. Результаты исследования будут способствовать расширению представлений о теоретико-методологических подходах к анализу бардовской песни, а также об уникальности авторских кодов идейно-субъектной структуры андеграундного искусства 80-х гг. XX в.

***Ключевые слова:*** Александр Башлачёв; андеграунд; канон; рок-поэзия; субъектная организация.

## ABOUT THE TOKEN CANONICAL POETICS IN THE ROCK-THE POETRY OF A. BASHLACHEV («On the life of poets»)

***E. V. Loktevich***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: E. V. Loktevich (lichorad.kat@mail.ru)*

The identification and interpretation of the characteristics of subject-shaped structure of the rock-the poetry of A. Bashlachev is an actual problem